**ВЕЧАР ЛІТАРАТУРНЫ** – адзін з відаў пазакласнай працы па літаратуры. Вечар літаратурны спрыяе паглыбленаму вывучэнню літаратуры, развіццю творчых здольнацей школьнікаў і ўплывае на фарміраванне іх эстэтычнага густу. Настаўнік з’яўляецца дарадчыкам і памочнікам пры падрыхтоўцы вечароў. Да такіх пазакласных мерапрыемстваў важна далучыць як мага больш вучняў, прадугледзець для іх пасільныя і цікавыя заданні. На вечары літаратурным звычайна робяць справаздачу ўдзельнікі школьных літаратурных гурткоў.

Вечар літаратурны можа быць прысвечаны юбілею пісьменніка; творчасці некалькіх пісьменнікаў, звязаных падабенствам жыццёвага і літаратурнага шляху; адной літаратурнай тэме, роду, жанру; сувязі літаратуры з іншымі відамі мастацтва (тэатр, музыка, жывапіс).

Сучасная беларуская методыка вылучае наступныя формы правядзення вечароў літаратурных: вечар шырокай праграмы (даклад настаўніка або вучня і канцэрт мастацкай самадзенасці), вечар-сустрэча з пісьменнікам; вечар-спектакль, вечар чытання, вечар пытанняў і адказаў, вечар гульняў (віктарыны, інсцэніроўкі-загадкі, турніры, КВіЗ).